В вопросе проверки есть и такой аспект. Известно, что США имеют многочисленные военные базы на территории других стран. Мы хотели бы иметь инспекционный доступ на них, с тем чтобы быть уверенными, что запрещенная деятельность по тому или иному возможному соглашению не осуществляется на этих базах. Тут, видимо, потребуется и сотрудничество тех государств, на чьей земле эти базы расположены.

А еще лучше — вернуться к давней идее ликвидации иностранных баз. Возвратить и войска домой. Мы это относим и к самим себе. Первые практические шаги мы уже сделали. Как вы знаете, по согласованию с монгольскими друзьями выводим часть своих войск из Монгольской Народной Республики. Вывели шесть полков из Афганистана и отзовем оттуда весь свой воинский контингент в возможно более сжатые сроки. Но для решения этой проблемы нужна взаимность со стороны Соединенных Штатов и соседей Афганистана, нужны и международные усилия.

Претензий на обладание истиной в последней инстанции у нас нет. Мы с готовностью откликаемся на предложения, выдвигаемые другими странами, политическими партиями, общественными движениями, да и отдельными лицами. Советский Союз поддержал идеи создания безъядерного коридора в центре Европы, безъядерных зон на севере Европы, на Балканах, в южной части Тихого океана и в других регионах. По каждому предложению мы готовы проводить консультации в поисках наилучшего варианта, устраивающего всех.

Уважаемые гости! Товарищи! На вашем форуме была высказана перспективная и благородная идея — создать «Фонд выживания человечества». В рамках этого института могли бы проводиться открытые обсуждения вопросов предотвращения ядерной войны. Фонд мог бы поощрять исследования по жгучим проблемам международной жизни, содействовать разработке проектов по глобальным проблемам человечества, включая и борьбу с новейшими пагубными болезнями.

Со своей стороны мы будем приветствовать активное участие советской общественности — и материальное, и интеллектуальное — в деятельности такого фонда.

Не сомневаюсь, что добрые семена работы вашего форума принесут всходы. Силы милитаризма — а они сплошь и рядом — синоним сил невежества и духовной слепоты — не всемогущи.

В возникновении движения ученых за предотвращение ядерной опасности, в страстных и глубоко компетентных выступлениях врачей, экологов, деятелей культуры и искусства, в рождении различных антиядерных объединений и ассоциаций — безошибочные свидетельства решимости мыслящего человечества спасти на Земле драгоценный дар жизни, может быть, единственной во Вселенной.

В [illegible] аудитории представлены [illegible]литика и политические науки. Я задаюсь вопросом: можем ли мы, располагая сегодняшними знаниями, сегодняшним опытом, шаг за шагом идти к более ровным и гармоничн[illegible]еждународным отношени[illegible] к утверждению всеобъемлющей системы международной безопасности, надежной и равной для всех? По-моему, можем и должны.

Думаю, надежда и стремление найти положительный ответ на этот вопрос привели вас и на этот широкий форум.

Великий наш ученый Владимир Иванович Вернадский еще в 1922 году (подумайте только — 65 лет назад!) предупреждал: «Недалеко время, когда человек получит в свои руки атомную энергию, такой источник силы, который даст ему возможность строить новую жизнь, как он захочет... Сумеет ли человек воспользоваться этой силой, направить ее на добро, а не на самоуничтожение? Дорос ли он до умения использовать ту силу, которую неизбежно должна дать ему наука? Ученые не должны закрывать глаза на возможные последствия их научной работы, научного прогресса. Они должны себя чувствовать ответственными за последствия их открытий. Они должны связать свою работу с лучшей организацией всего человечества».

Вдумайтесь в эти слова. Раньше человеческая мысль безоглядно стремилась к тому, чтобы подчинить силы природы. Теперь вторжение в природу без предварительного учета всех последствий может превратить ее в смертельного врага человечества. Чернобыльская авария напомнила нам об этом трагедией сравнительно локального масштаба. А гонка ядерных вооружений неумолимо влечет нас к вселенской трагедии.

Веками люди искали пути к достижению бессмертия. Трудно смириться с тем, что каждый из нас смертен. Но смириться с конечностью всего человечества, человеческого разума невозможно.

К сожалению, многие из нашего поколения **свыклись с ядерным оружием.** У многих оно стало своего рода идолом сознания, требующим все новых жертв. Есть и такие, которые гонку ядерных вооружений объявляют чуть ли не гарантией сохранности мира.

Увы, ядерное оружие во многом сформировало облик времени, в котором мы живем. Разумеется, его уничтожение не означает возвращение к тому, что было до него. Необходимо, чтобы отказ от ядерного сдерживания не развязал руки любителям военных авантюр.

Вопрос этот отнюдь не праздный. Иные видят ответ на него в совершенствовании других компонентов военной мощи, обычных вооружений. Это непригодный, порочный путь.

В последъядерную эру человечество должно прийти окрепшим, превозмогшим ядерный недуг. Оно приобретет иммунитет к насилию, к попыткам диктовать свою волю другим. Сейчас международные отношения обездушены культом силы, милитаризацией сознания. Отсюда и **задача очеловечить международные отношения.**

Возможно это или нет? Одни считают, что возможно. Другие — что нет. Об этом не стоит сейчас спорить. Думаю, необходимая объективная потребность возьмет свое. Народы в целом уже осознают это все больше. Созрело понимание, что ядерную войну вести нельзя. Так сделаем для начала первый большой шаг — сократим ядерные арсеналы, не пустим оружие в космос. Давайте воспользуемся рубежами, на которые вышли в **Рейкьявике,** и будем двигаться дальше. И посмотрим, как это повлияет на международную атмосферу. Я лично думаю, что с каждым таким шагом будет расти доверие и будут открываться новые горизонты сотрудничества. А этому должны помочь и демократизация мышления на международном уровне, и равноправное, самостоятельное и активное участие в делах мирового сообщества всех государств — больших, малых, средних.

Для «очеловечения» международных отношений нужны соответственные действия и в гуманитарной области, в частности в том, что касается информации, контактов между людьми, творческих обменов и т. п. Это поможет создавать нравственные гарантии сохранения мира и тем самым содействовать выработке гарантий материальных. Информационная агрессия, практикуемая некоторыми странами, ведет не только к духовному оскудению, но и мешает нормальному общению людей разных стран, взаимообогащению культур. Она порождает неприязнь и отчуждение между народами. Между тем согласитесь, что народ, знающий и ценящий культуру и искусство других народов, не может к ним испытывать недобрых чувств.

Господа! Товарищи! Время как бы сжимается по мере нарастания опасности нового витка гонки вооружений, а также в связи с резким обострением региональных и так называемых глобальных проблем. И нельзя больше тратить его на попытки переиграть друг друга, добиться односторонних преимуществ. Ставка в такой игре слишком велика — выживание человечества. Поэтому учет критического фактора времени становится жизненно необходимым.

Пусть же идеи форума дойдут до всех уголков Земли, приблизят прозрение, расширят взаимопонимание, пусть ваши усилия помогут продвижению к свободному от ядерного оружия, ненасильственному миру — ради бессмертия человеческой цивилизации!

(Речь М. С. Горбачева была выслушана с большим вниманием и неоднократно прерывалась аплодисментами).

Вячаслаў АДАМЧЫК

ГОД НУЛЯВЫ

УРЫЎКІ З РАМАНА

[Працяг. Пачатак у № 8].

Хрысця, збітая з панталыку, ужо маўчала — не магла дабраць у галаве: ці распытвае, ці здзекуецца з яе Суля.

— Ну што маўчыш? Што я табе не ўнаравіла? Зацялася ўжо,— Суля распытвала доўга, усё паўтараючы гэтае сваё «а што, мо не праўду кажу», то адкуль яна, то колькі год, то дзе бацькі, і, калі Хрысця прызналася, што з Верасава, раптам закрычала:

— Вуй, гэтае Верасава. Вуй, далося яно мне ў знакі. Як ужо і верыць каму. То гэты Літапар ваш стурбаваў мне галаву...

— Літавар мо? — перапытала Хрысця.

— Ну хай сабе Літавар, то Люпіна, другі год грошы не аддае. Пазычыла і не аддае. Вуй, гэтае Верасава, вой, якія там людзі. І каму ўжо цяпер даваць веры? Ну каму? Бога не гняві і людзей не смяшы.

— З дому прагналі мяне,— сказала Хрысця.

— Дзіва што, гэткія людзі,— падтакнула Хрысці і, трохі памякчэўшы, адышоўшы ад злосці, спытала ўжо: — Галодная? — І адказала сама: — Ды няўжо ж.

Яна і накарміла ўчора Хрысцю, і нанач да сябе ўзяла. Паслаўшы ў цесным, абклееным зялёнымі шпалерамі пакойчыку на расхістаным тапчане, прынесла лёгкае рыпучае крэсла, пасядзела, трымаючы рукі на тоўстых каленях, пагаравала разам і, нагнуўшыся, каб хто не чуў з хатніх, спытала:

— А можа, праз хлопца што? Можа, бацька за грэх які?..

— Ой, што вы, які ў мяне грэх? — жахнулася Хрысця, раптам успомніўшы і хрэсьбіны ў Ведравічах, і тую сваю п'яную сварбу з Алесяю, і тую цалюткую ноч, калі ўсе хрэсьбеннікі, што асталіся начаваць, агледзеліся, што яе нідзе няма. І слёзы раптам запяклі, засланілі вочы.

— Вох, зноў угнявіла цябе? — Суля нібы з перапуду паднялася і прыставіла да перагародкі крэсла, суцешыла: — Не плач, знойдзем ратунак, кажуць, Грабянка напытвае няньку.

Суля яшчэ пастаяла ў дзвярах перагародкі, павохкала, жмурачыся на электрычную лямпачку з фарфоравым патронам, і, згасіўшы святло, патупала ў другі пакой — па рэдкай занавесцы яшчэ доўга поўзаў яе цень, рыпелі дошкі падлогі, і чуваць была неразборлівая для Хрысці яўрэйская гутарка. Суля гаварыла пра нешта з сваім нездароўчым з выгляду, нізенькім, усяго ёй па плячо, мужыком, што ўсё ціха соп, прыглядаючыся да Хрысці, калі яны прыйшлі ў хату.

А Хрысця вокам не звяла. Нейкім ясным і танюсенькім, як вада з капяжа, струменьчыкам з памяці цадзілася тое даўняе здарэнне, калі яна малою першы раз прыбегла ў Дварчаны, незнарок адбіўшыся ад большых дзяўчат, асталася адна на людной вуліцы. Прыганула тое чутае, што ў смех расказвалі ўдома, як яўрэі ловяць і кідаюць у кадушку з цвікамі малых дзяцей. Ды яшчэ качаюць тую кадушку, а з цябе свішча кроў. А потым чалавечую кроў у мацу дабаўляюць.

І Хрысця, здранцвеўшы ад страху, паляцела што было моцы з мястэчка, азіраючыся на яўрэйскія крамы, каб праўда хто спадцішка не схапіў і не ўкінуў у тую бочку з панабіванымі цвікамі.

І, божа літасцівы, як яна перапалохалася і як заенчыла немым крыкам, калі незнарок на рагу вуліцы наскочыла на кульгавага з жоўтаю кацубою яўрэя і, падняўшы вочы, убачыла яго чорную, на два доўгія кліны, бараду. Гэта быў ён, мусіць, Сулін мужык.

Потым, пасталеўшы ўжо, брыдзілася есці, калі хто даваў пакаштаваць гэтую сухенькую, прэсную, мусіць, спечаную на адной нішчымнай вадзе, іхнюю мацу — баялася ўсё, што, можа, і праўда ў ёй ёсць чалавечая кроў...

На чым разарваўся гэты ясны шнурок успамінаў, Хрысця сёння і не помніла, як і не помніла свайго зблытанага і нейкага спакутаванага сну.

Разбудзіў яе ранні шчэбет ластавак. І ад іхняй вясёлай вострай шчабятні, ад яснасці ў акне і малінавай чырвані, што, коса прабіўшыся ў куток пакойчыка, затлелася на вялікіх зялёных кветках шпалераў, Хрысцю ўзяла нечаканая радасць. Яна нават забылася пра ўсё тое, што так страшна і раптоўна навалілася на яе ўчора разам з гэтым злым і помслівым крыкам старога Корсака, пра ўсё тое, што перадумала, бегучы ў Дварчаны, а сёння, здаецца, яна ачуняла, як ад цяжкае абложнае хваробы, ад усяго таго свету, што захмурнеўся і змерк перад ёю ўчора, і яна, ужо нібы адыходзячы ад памяці, нічога не бачыла і не разбірала перад сабою.

Цяперашняя радасць была танюткая і бліскучая, як павучынка, і пералівалася мігатлівай чырванню, як пераліваецца ў лесе на лапічку сонца нацягнутая між шурпатых камлёў хвоек ці аброшаных густых ялін танюткая павучынка. Яна шчымела ў душы, займаючыся і яснеючы, як дзень. І Хрысці зноў прыгануўся Імпол[illegible]муры смутак нечаканага ж[illegible] разарваў гэтую танюткую, што востра бліснула, павучынку радасці. Як жа ж ён там, у злым, зайздросным Верасаве. Пэўна ж, трудна аднаму сярод помслівых плётак і чужых [illegible]звораў. Ды як жа ж жыць, [illegible]і на цябе нават міла не ўзгляне яна, заюхленая ад злосці Алеся. Літасці ад яе не чакай. Не... Трэба яму сысці ад ўсяго таго грэшнага і злога, што ўчынілася там, у Верасаве. Звяла яна са свету свекрыву з залувіцаю, звядзе і яго.

Хрысця задыхнулася ад страху: божа, што яна думае! Ды нашто яны ёй? Імполь, Алеся. Яны завілі сваё гняздо. Якое ўжо ні ёсць. А што жджэ яе, Хрысцю?

Ізноў усё ўчарашняе, як страшная абложная хмара, завалакло, засланіла перад вачмі свет.

Ужо не чуючы ні гэтага пералівістага шчэбету ластавак, не бачачы ні яснай чырвані маладога маёвага дня, што распальваўся за акном, скоранька ўсхапілася з тапчана.

За дашчанай, абклеенай шпалерамі перагародкай пад цяжкаю хадою, нібы просячыся, суха зарыпела падлога.

Хрысця спалохана адскочыла за карычневую на высокіх ножках шафу — баялася, каб, крый бог, хто не ўбачыў яе ў незашнураваным станіку. Цікавала адтуль адным вокам на выцвілыя салатавыя занавескі. Нейчыя пухлыя кароткія пальцы злавілі і зграблі лёгкі паркаль. У пройму дзвярэй усунулася Суля. Склаўшы на пукатым цяжкім жываце голыя, упэцканыя ў цесце і абцярушаныя мукою рукі, спытала:

— А ты ўжо не спіш?

Хрысця захінулася далей за шафу, скоранька накінула на сябе паркалёвую блузку.

— Чаго ты хаваешся, чаго? Чуеш? — Суля скрыва, адным вокам старалася зазірнуць за шафу. — Я ўжо збегала да Грабянкаў. Нараіла ім цябе. Чуеш?

Раптоўны холад страху, нібы скразняком, абвеяў Хрысцю — няўжо так нечакана пераменіцца яе жыццё і, бог святы ведае, якое яно цяпер будзе? Холад, што падняўся спадыспаду душы, закалаціў рукі. Дрыготкія пальцы ніяк не маглі злавіць кругленькія бубкі звязаных з ніткі гузікаў.

— Я ўжо не ведаю, як вам і дзякаваць, — Хрысця нарэшце зашпіліла іх, правяла рукою зверху ўніз — ці ўсе, і высунулася з-за шафы.

— Дзякуй скажаш потым, а цяперака ідзі снедаць, — сытаю, упэцканаю ў цеста рукою Суля развяла лёгкія салатавыя занавескі і схавалася за імі.

Пераходзячы прасторную святліцу, нечакана, нават сумеўшыся, Хрысця ўбачыла збоку сябе нібы знаёмую лупаваценькую дзяўчыну і прыстакнула, каб прапусціць яе. І раптам жахнулася, пазнаўшы ў вялікім з вытачанай аправай люстэрку самую сябе.

Спярша дзіва, а потым і смех разабраў Хрысцю — гэта ж жарты, не пазнала сама сябе. Але ж калі яна глядзелася ў гэтакае вялікае люстэрка? Хіба толькі ў цёмную, з радужным адлівам шыбу, калі бегла на сяло і прыпынялася перад акном, каб паправіць хустку ды падгладзіць пад яе растрэпаныя валасы.

Стоячы перад гэтым вялікім у прыгожай аправе люстэркам, Хрысця нават залюбавалася сабою, сваімі густымі высакавата, па цяперашняй модзе, падрэзанымі валасамі, сваім надзьмутым дзіцячым тварком, усёй сваёй спрытнай паставай. Адну толькі ганьбу дала сабе — нізкаватая і дробная. І ніколечкі не горшая за гэтую сытую, што разлілася ў сваёй паўнаце, Алесю.

Крышку павесялелая, усцешаная, як забаўкаю дзіця, увайшла ў невялічкую, прапахлую смажанаю цыбуляю ды цымусам Суліну кухню.

За доўгім, засланым прапаленаю цыратаю шкапчыкам сядзеў, нацягнуўшы нізка на лоб пляскатую замусоленую кепку, Сулін муж. Сапучы ў даўгаваты нос, сёрбаў рэдзенькую, забеленую пшонную зацірку.

«Вой, дык чаму ж ён у шапцы есць?» — Хрысцю зноў разбіраў гэты дзіцячы, перамешаны з дзівам смех.

— Ну, садзіся, не бойся яго, — Суля, мусіць, злавіла гэты перапалоханы Хрысцін зірк.

— Дайце ж рады, я хоць твар спаласну.

— Умывальнік вунь у сенцах, —паказала Суля на філянговыя, з вострым ромбікам пасярод планак, непрычыненыя дзверы.

Пасвяжэлая, расчырванелая ад халоднай вады і ручніка, Хрысця вярнулася ў кухню ўжо тады, калі Сулінага мужыка тут не было — на табурэце, з прарэзанаю для трох пальцаў дзіркаю, сядзеў шары, з зеленаватымі прыжмуранымі вачмі сыты кот. Муркаў у натапыраныя сіваватыя вусы. З талеркі пахла смажанымі катлетамі. Суля ўкалола ў іх вострым трохзубым відэльцам, кінула дзве на сподак перад Хрысцяй.

— Вой, больш не трэба.

— Што, маладая і не з'ясі дзве катлеты?

— А я не ведаю, я іх ніколі не каштавала.

— Вуй, дзеўка, смех мяне бярэ, на цябе гледзячы. Як ты жыць будзеш? Як? — Суля, падпёршы рукою сытае падбароддзе, глядзела на Хрысцю рудымі лупаватымі вачмі. Над правым брывом падымалася рудаватая барадаўка, растапырваючы чырвоныя валаскі.

— Ці ж я ведаю,—прызналася Хрысця, каштуючы катлету і крышку дзівячыся, што з яе за смак — чуваць адна цыбуля.

— Вы чуеце, яна не ведае,— нібы перадражніла яе Суля, а потым суцешыла і сябе, і ўжо яе, Хрысцю:—Але, праўда, цяпер табе абы-дзе прыткнуцца, абы дзень да вечара, а там пашукаем якой рады. Табе абы зачапіцца, а там час пакажа.

Гаварыла яна пра гэта і дарогаю, падводзячы сюды, на блізенькую пясчаную вуліцу, да гэтага ашалёванага і выфарбаванага ў карычневы колер дома, сцішаную ад раптоўнага схаладзелага страху Хрысцю.

Прыпынілася за сонна-жоўтым кустом акацыі і, пусціўшы наперад Хрысцю, нават штырханула яе ў плечы, падпіхаючы да нізкіх расхрыстаных веснічкаў.

— Ідзі, кажу табе, чаго маеш баяцца.

— Саромеюся я, — скамянела на месцы Хрысця.

— Вой, дзяўча, гаворыш абы-што.

— Баюся.

Але Суля нібы не чула гэтага жалоснага Хрысцінага голасу, памалу цяжкімі, мусіць, хворымі нагамі закалывалася назад.

Хрысця, абамлеўшы, як сярод глыбокай вады, стаяла цяпер адна: і руку няма каму падаць, і да берага страшна ісці, а можа, там — вір?

Яна азірнулася назад — за рогам пло[illegible] плыла, то крышку запада[illegible] за вострыя шчыкеціны, то [illegible]казваючыся, сівая праставалосая Суліна галава — і памаленьку, як праз глыбокую цёмную ваду, баючыся, каб не трапіць на вір, пайшла па цэмент[illegible]іх плітках ходніка пад вост[illegible] падпёртую двума выштук[illegible]ванымі слупкамі, стрэшку ганка. Цікуючы ў адчыненую палавінку акна, дзе на лёгкім прапахлым ветранінай скразняку ўздыхала белая, падшморгнутая на шнурку фіранка, паднялася па сходцах на ганак. Абамлела ад яго глыбокае гулкае пустаты пад нагамі, але зарадавалася, што ў хаце, можа, чуюць і нехта зараз вызірае на яе тупат.

Але нават у задушным ад нявыветранага покасту калідорчыку, дзе было аж чацвёра белых выфарбаваных дзвярэй з меднымі бліскучымі ручкамі, ніхто яе не чуў.

Хрысця няўмела, усім кулаком, але як вучыла Суля, пастукала ў тыя непрычыненыя, што былі перад ёю. За дзвярмі толькі расплылася і асела цішыня.

Сцяўшы дых, Хрысця паслухала яе і пацягнула да сябе за медную, выгнутую рыбкам прыгожую ручку. Тут была кухня — на стале бялелі не прыбраныя пасля снедання талеркі.

Нібы ўзрадаваўшыся, што нікога ў кухні няма, Хрысця завярнула назад. З душы звальвалася нешта цяжкае — можа, на лепшае, што няма.

Лёгка, вясёлая ўжо, вышмыгнула з сухога, прапахлага покаставай фарбай калідорчыка на ганак.

Памахваючы сваім пакуначкам і чуючы, як збаўленне, яснае сонца на вачах, вузенькім цэментовым ходнікам дабегла да нізкіх веснічак. Сонным пчаліным гудам звінеў жоўты куст акацыі. Мяккі грудны голас клікаў некага. Хрысця, прыпыніўшыся на міг, прыслухалася да яго. Гукалі недзе за спіною. Яна абярнулася. Адсланіўшы фіранку, з адчыненай палавінкі акна вызірала абсыпаная кудзеркамі бялявых валасоў прыгожая, як у анёла, галоўка.

— Вы да нас?

— Ага, — прызналася і раптам пашкадавала Хрысця.

— Я чула, што вы стукалі, але ад дзіцяці баялася адысціся, якраз засынала. То проша, — бялявая ў кудзерках галоўка схавалася за карункавымі кветкамі гардзіны.

Хрысця паволі паднялася на гулкі з прыгожымі павыразанымі балясамі ганак.

У прапахлым покаставай фарбай калідоры бакавыя белыя дзверы адчыніліся ўжо самі, і на Хрысцю дыхнуў густы, перастоены пах духоў, пах дзіцяці, пах цёплага жаночага малака.

Высокая і танюткая, як трасціна, маладзіца, спешна зашпільваючы на худых жаўтлявых каленях расхрыстаны халацік, шэптам запрасіла Хрысцю ў пакойчык. Пагрукваючы на падлозе пукатымі, прыбітымі да ножак скобкамі, зводдаль ад дзвярэй пакалыхваўся караткаваты з рэдзенькімі драбінцамі дзіцячы ложак.

Заплюшчыўшы вочкі і моршчачы лобік, мардаценькае дзіця пасмоктвала прыгожую з белай шляпкай і зялёным кольцам соску.

— Вы, мусі, ад Сулі? — азіраючыся на дзіцячы ложак, спытала маладзіца.

— Ну але, — маргнула сваім лупаватым вокам Хрысця, цікуючы на гэтую ценькую, далікатную тваркам маладзіцу і не чуючы ўжо ніякага перад ёю страху.

— Так-так, яна мувіла нам... Але проша сядаць, — маладзіца паказала на круглае, з выгнутай спінкай крэсла пад лапушыстым фікусам. На зломаным лістку густым малодзівам выслезіўся сок.

Наровячы, каб і самой дзе не пашкодзіць вазон, Хрысця адставіла далей крэсла, асцярожна прысела, прытоптваючы на прыполе свой лёгкі пакунак. Асцярожна спадылба агледзела абклееныя прыгожымі, у чырвоныя ружы, шпалерамі пакой: на тыльнай сцяне на чырвона-стракатым, што аж калоў вочы, дыване блішчалі дзве скрыжаваныя шаблі, а над парогам страшна разявіла лыч касмата-бурая свіная галава з жоўтымі ікламі.

Мусіць, змеціўшы, з якім дзівам Хрысця косіцца на гэту галаву, гаспадыня хітра ўсміхнулася:

— То вепш. Ну, дзіка свіння.

— Няхай крые бог, мусіць, вялікая была, — яшчэ болей усмяшыла гаспадыню Хрысця, бо тая, бліснуўшы з куточка рота залатою каронкай, зарагатала зноў.

— Вой, якая ты наіўная.

— Што кажаце? — перапытала Хрысця, не зразумеўшы гэтае астатняе слова.

— Мувем, жэ ты естась ешчэ дзецко.

— Што вы!.. Я ўсё ўмею рабіць...

— Я не о тым, — затрасла кудзеркамі бялявых, перавязаных чорнаю аксамітнаю стужкаю валасоў маладзіца і азірнулася на дзіцячы ложак.

Павярнуўшы галоўку ў карункавай шапачцы, дзіця стрыгла сінявата-круглымі вочкамі.

— Ты ўжо гэтак спіш? — пакруціла галавою маладзіца.

Дзіця зацмокала губкамі, чуючы ў сябе каля шчакі пустышку, і паварочвала галоўку, стараючыся злавіць яе ў рот.

Гаспадыня адкінула коўдру і, падсунуўшы пад галоўку руку, падняла гэты перавязаны шырокім поясам і ўжо мокры, падпараны пакуначак.

— Во зобач, то твая няня. Но тылько я не вем, як она называсе.

— Хрысця я, Хрысця, — прыцмокнула языком Хрысця.

Дзіця ўсміхнулася, паказваючы свае бяззубыя чырвоныя дзясны.

Хрысця працягнула рукі, каб узяць яго да сябе.

— О не, то невольно,—маладзіца, прыціснуўшы да грудзей дзіця, крутнулася ўбок.— Цябе яшчэ не збадаў* доктар...

— А нашто доктар? — спусціла рукі Хрысця.

[Працяг будзе].

* Збадаў — праверыў.

ДА 65-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ ІНСТЫТУТА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

ПЕРШЫ НАВУКОВЫ ЦЭНТР РЭСПУБЛІКІ

Стварэнне і развіццё Інстытута беларускай культуры — першага навуковага цэнтра рэспублікі — непарыўна звязана з усталяваннем сацыялістычнага ладу. Гэта быў і адзін з першых крокаў на шляху ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі ў занядбаным і адсталым краі колішняй імперыі. Ужо ў першыя гады Савецкай улады карэнныя грамадска-палітычныя і эканамічныя пераўтварэнні паклалі пачатак змяненню сацыяльнага аблічча Беларусі, ператварыўшы яе ў рэспубліку з развітой эканомікай, высокім узроўнем культуры і навукі.

З першых год свайго існавання Савецкая дзяржава ўзяла курс на паскоранае развіццё навукі, разглядаючы яе як важнейшы элемент дзяржаўнай палітыкі. Камуністычная партыя і Савецкі ўрад зрабілі вялікую работу па выкананню ленінскага ўказання аб тым, «каб веды і навукі перасталі быць справай прывілеяваных, перасталі быць матэрыялам, які ўмацоўвае пазіцыю багатых і эксплуататараў, а ператварыліся б у сродак вызвалення працоўных і эксплуатуемых».

Бадай, самай надзённай задачай маладой Савецкай дзяржавы была задача ліквідацыі адсталасці ў эканамічных і культурных адносінах раней прыгнечаных народаў Расіі. Рабілася ўсё для стварэння спрыяльных умоў для развіцця беларускай культуры. Былі прыняты рашучыя меры па ліквідацыі непісьменнасці, развіццю сістэмы народнай адукацыі, арганізацыі вышэйшых навучальных устаноў.

Для развіцця вытворчых сіл нацыянальных рэспублік неабходна было стварыць мясцовыя навуковыя ўстановы. Буйныя навуковыя ўстановы, якія знаходзіліся ў асноўным у цэнтральных раёнах Расіі, ужо не маглі справіцца з тымі задачамі, якія былі пастаўлены перад навукай. Жыццё патрабавала больших маштабаў навуковых даследаванняў, накіраваных на пераадоленне тэхніка-эканамічнай адсталасці нацыянальных рэспублік, вырашэнне праблем мясцовай эканомікі і культурнага будаўніцтва. Адной з першых устаноў, закліканых вырашаць гэтыя задачы, стала ў Беларусі шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова — Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт).

З моманту заснавання Інбелкульта ў пачатку 1922 года яму быў нададзены характар навукова-даследчай і культурна-грамадскай установы, прычым на пачатку існавання інстытута культурна-грамадскі характар яго дзейнасці пераважаў. Першымі правадзейнымі членамі інстытута сталі вядомы філолаг і этнограф Я. Карскі, беларускія пісьменнікі Янка Купала і Якуб Колас. Старшынёй Інбелкульта стаў мовазнавец С. Некрашэвіч. У пачатковы перыяд дзейнасці інстытут асноўную ўвагу ўдзяляў пытанням вывучэння літаратуры, гісторыі, этнаграфіі і, галоўным чынам, распрацоўцы практычных праблем беларускага мовазнаўства. Са стварэннем Беларускай ССР узніклі магчымасці для шырокага выкарыстання на ўсіх сферах жыцця беларускай мовы. Яна стала мовай дзяржаўнай. У гэтых умовах неабходна было, перш за ўсё, выпрацаваць навукова-тэхнічную тэрміналогію на беларускай мове. Пачаўшы сваю дзейнасць з даследаванняў у галіне гуманітарных навук, Інбелкульт пастулова асвойвае і іншыя напрамкі навуковай думкі.

У 1924 годзе Інстытут беларускай культуры быў абвешчаны вышэйшай дзяржаўнай навуковай установай у Беларусі, што вызначыла перспектыву яго далейшага развіцця як вядучага цэнтра навукі ў рэспубліцы.

У 1925 годзе ў Інбелкульце было створана 10 пастаянных камісій у асноўным гуманітарнага профілю: дыялекталагічная, гісторыка-археалагічная, па вывучэнню рэвалюцыйнага руху ў Беларусі, па ахове помнікаў даўніны, мастацтва і прыроды, па вывучэнню прыроды Беларусі і яе прадукцыйных сіл, па вывучэнню народнай гаспадаркі Беларусі, па выданню твораў У. І. Леніна, па вывучэнню савецкага будаўніцтва, этнаграфічная, бібліяграфічная, а таксама Цэнтральнае бюро краязнаўства, якое існавала на правах самастойнай камісіі. Акрамя гэтага, у інстытуце меліся яўрэйскі і польскі аддзелы, бібліятэка і выдавецтва. Тады ж Дзяржплан БССР перадаў Інбелкульту Камісію па вывучэнню прыро[illegible]х прадукцыйных сіл, як[illegible]дыграла значную ролю ў вывучэнні рэспублікі.

Маючы малы штат навуковых супрацоўнікаў, Інбелкульт залучаў спецыялістаў з наркаматаў, навук[illegible]даследчых устаноў і выш[illegible]х навучальных устаноў да работы ў сваіх секцыях, якія з'яўляліся па характару дзейнасці навуковымі таварыствамі. Усяго ў 1925 годзе было створана 10 секцый, прыкладна таго ж профілю, што і пастаянныя камісіі. Дзейнасць секцый выяўлялася ў форме заслухоўвання і абмеркавання навуковых дакладаў і насіла ў асноўным арганізацыйны характар. Такім шляхам інстытут спрабаваў ажыццявіць аб'яднанне і каардынацыю навуковых даследаванняў у рэспубліцы.

Да работы Інбелкульта былі запрошаны вядомыя дзеячы навукі і культуры Беларусі — мовазнаўцы П. Бузук, М. Дурнаво, літаратуразнаўцы І. Замоцін, В. Мачульскі, гісторыкі У. Ігнатоўскі, У. Пічэта, А. Ясінскі, пісьменнікі Д. Жылуновіч, М. Гарэцкі, прадстаўнікі прыродазнаўчых навук Я. Афанасьеў, М. Блідухо, А. Дубах, А. Фядзюшын і іншыя.

У 20-я гады навука з'яўлялася арэнай вострай ідэалагічнай і палітычнай барацьбы. Вялікую шкоду прынеслі нацыяналістычныя тэндэнцыі, якія не абмінулі і Інбелкульт і праявіліся ў некаторых яго працах. З боку асобных прадстаўнікоў інтэлігенцыі назіраліся імкненні абмежаваць нацыянальна-культурнае будаўніцтва толькі развіццём духоўнай культуры (мова, гісторыя, літаратура, мастацтва і г. д.) і недаацэньвалася стварэнне эканомікі, якая ў сапраўднасці з'яўлецца фундаментам нацыянальна-культурнага сацыялістычнага будаўніцтва. Пры гэтым былі спробы адысці ад формулы «культура пралетарская па змесце і нацыянальная па форме» ў бок падмены пралетарскага зместу дробнабуржуазным.

Нягледзячы на даволі шырокі размах збіральніцкай і часткова даследчай работы, развіццё навукі ў Беларусі ў гэты перыяд насіла ў асноўным колькасны, апісальны характар. Навуковая тэорыя і глыбокае вывучэнне падзей і працэсаў пакуль сталі на другім плане.

Неабходна было расшырыць дзейнасць інстытута, асабліва за кошт развіцця прыродазнаўчых і тэхнічных навук, зыходзячы з патрэб развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі.

Быў павялічаны бюджэт Інбелкульта. На 1927/28 акадэмічны год ён быў зацверджаны СНК БССР у суме 359 тысяч рублёў, што перавышала бюджэт папярэдняга акадэмічнага года на 22,4 працэнта. Пастаянна расла колькасць супрацоўнікаў Інбелкульта. У трох інстытутах, на 15 кафедрах, у 3 самастойных камісіях, а таксама ў Батанічным садзе, хімічнай лабараторыі, заалагічным музеі, 2 нацыянальных сектарах і ўстановах, прэзідыуме Інбелкульта працавала ўжо 113 чалавек.

Найбольш значнымі былі дасягненні беларускіх вучоных у галіне грамадскіх, біялагічных, геалагічных, сельскагаспадарчых і хімічных навук. Вучоныя-мовазнаўцы, да прыкладу, распрацоўвалі навуковую тэрміналогію для асобных галін ведаў і выдалі 19 тэрміналагічных зборнікаў. Быў выдадзены таксама тэрміналагічны атлас гаворак Беларусі. Літаратуразнаўцы паспяхова працавалі над падрыхтоўкай да друку акадэмічных выданняў збораў твораў паэтаў і празаікаў рэспублікі. Этнографы вывучалі беларускую фальклрыстыку, народную музыку. Яны сабралі да 30 тысяч тэкстаў песень, казак, прыказак, выдалі альбом беларускага арнаменту і апісанне беларускага нацыянальнага адзення. Гісторыкі пачалі выданне архіўных матэрыялаў, вывучэнне рэвалюцыйнага руху ў рэспубліцы. Беларускімі філосафамі пачалі праводзіцца даследаванні па дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму. Даволі шырокае развіццё ў Інбелкульце, асабліва ў апошнія гады яго дзейнасці, атрымалі і прыродазнаўчыя навукі.

Геалагічныя экспедыцыі правялі падрабязныя даследаванні значнай часткі тэрыторыі рэспублікі і выявілі немалыя запасы карысных выкапняў, якія маглі служыць сыравіннай базай для развіцця шэрагу галін прамысловасці — шкляной, цэментавай, керамічнай, па выпрацоўцы мінеральных угнаенняў і інш. Вучонымі Інбелкульта былі складзены глебавыя карты значнай часткі тэрыторыі рэспублікі, якія шырока выкарыстоўваліся пры аказанні агранамічнай дапамогі, землеўпарадкаванні, меліярацыі і г. д. Значная работа праводзілася па выяўленню гідраэнергарэсурсаў рэк, быў складзены іх поўны каталог. Вялікае значэнне мелі геамагнітныя і геабатанічныя здымкі тэрыторыі БССР.

Даследаванні вучоных інстытута адпавядалі інтарэсам народнай гаспадаркі рэспублікі. Асабліва вялікай была роля Інбелкульта ў развіцці культуры беларускага народа.

Такім чынам, Інстытут беларускай культуры ўнёс істотны ўклад у савецкую навуку і культуру і стаў асновай для стварэння ў 1929 годзе Акадэміі навук БССР.

Мікалай ТОКАРАЎ.

ІДУ ДА ВАС З ПЕСНЯМІ



У гэты вечар у Доме афіцэраў у Мінску было вельмі ажыўлена. На сустрэчу з заслужаным дзеячам мастацтваў БССР Леанідам Захлеўным сабраліся воіны Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, ветэраны Савецкай Арміі і Вялікай Айчыннай вайны. Такая сустрэча не выпадковасць: у Леаніда Захлеўнага цесныя сяброўскія сувязі з людзьмі ваенных прафесій, якія сваё жыццё прысвяцілі нялёгкай справе абароны Радзімы. Кампазітар даволі часта бывае ў воінскіх часцях, выступае ў салдацкіх клубах, прыязджае на сустрэчы былых франтавікоў. І таму сярод прысутных у Доме афіцэраў Леаніда Захлеўнага многія ведаюць. За цыкл ваенна-патрыятычных песень «Я перад вамі з памяццю сваёй» кампазітар быў узнагароджаны дыпломам і медалём імя Аляксандрава, а за вакальны цыкл «Памяць» яму прысуджана званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

У своеасаблівую творчую справаздачу кампазітара перад сваімі слухачамі ператварылася гэта сустрэча, прымеркаваная да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. У ёй прынялі ўдзел салдаты і афіцэры розных пакаленняў, былыя франтавікі, ветэраны Вялікай Айчыннай. Сярод іх — Герой Савецкага Саюза Аляксандр Барда[illegible]былая медыцынская сястра [illegible]оф'я Кунцэвіч. Гэтая мужная жанчына ў час вайны служыла ў пяхоце, вынесла на сваіх плячах з поля бою 147 ранен[illegible]йцоў, выратаваўшы ім жыц[illegible] Ужо пасля вайны ёй была ўручана міжнародная ўзнагарода — медаль «Флорэнс Найцінгейл».

Гасцямі сустрэчы былі і беларускія паэты, на чые вершы Леанід Захлеўны піша музыку. Даўняя дружба звязвае кампазітара з Міхаілам Ясенем, таксама франтавіком. Плён іх творчага супрацоўніцтва — такія шырока вядомыя песні, як «Заўсёды спяшаюся да цябе», «Гісторыя аднаго кахання», «Перамога», «Ветэраны ў страі застаюцца». Апошняя іх сумесная работа — «Кастрычніцкі марш». Гэтай песняй у выкананні заслужанага артыста рэспублікі Віктара Скарабагатава пачаўся вялікі канцэрт, у якім прынялі ўдзел народны артыст БССР Віктар Вуячыч, заслужаныя артысты рэспублікі Валянціна Пархоменка і Валерый Кучынскі, сімфанічны аркестр і дзіцячы хор Беларускага тэлебачання і радыё, ансамбль песні і танца ЧБВА, народны вакальны ансамбль ветэранаў вайны і арміі Дома афіцэраў, вакальна-інструментальны ансамбль «Сябры». Цікавыя гуткі кампазітара са слухачамі адбыліся ў час гэтай сустрэчы. На дзесяткі пытанняў адказаў Леанід Захлеўны. І ў сваю чаргу давядаўся пра сённяшнія ратныя будні салдат і афіцэраў Савецкай Арміі, пра іх вучобу, адпачынак, захапленні, пра папулярныя ў асяроддзі моладзі песні.

Сустрэча кампазітара трансліравалася па Беларускім тэлебачанні.





НА ЗДЫМКАХ: кампазітар на сцэне; Л. ЗАХЛЕЎНЫ гутарыць з удзельнікамі сустрэчы; вакальна-інструментальны ансамбль «Сябры» выканаў песні кампазітара.

Фота Ю. ІВАНОВА.

КАЛІ ВАС ЦІКАВІЦЬ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА...

У 1987 ГОДЗЕ ВЫДАВЕЦТВЫ РЭСПУБЛІКІ ВЫПУСЦЯЦЬ:

Я. БАБОСАЎ. «XXVII з'езд КПСС аб стратэгіі паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны».— Мн., «Навука і тэхніка».

Раскрываецца сутнасць ленінскага вучэння аб стратэгіі партыі і яго развіццё XXVII з'ездам КПСС. Дадзены аналіз асноўных фактараў паскарэння сацыяльнага і эканамічнага прагрэсу, удасканалення арганізацыі і ўмоў працы, гаспадарчага механізма.

В. БЫКАЎ. «Кар'ер». Аповесць.— Мн., «Мастацкая літаратура».

Новая кніга Васіля Быкава вяртае нас да дзён Вялікай Айчыннай вайны, у год 1941. У невялікім гарадку зataілася жыццё. Аднак гэта падманлівы спакой. Жыхары не скарыліся акупантам. На барацьбу з імі ўзнімаецца і моладзь. У гэтай барацьбе не на жыццё, а на смерць адны праяўляюць найвышэйшую сілу духу і патрыятызму, іншыя ідуць на здзелку з сумленнем.

В. ЗУЁНАК. «Вызначэнне». Вершы.—Мн., «Мастацкая літаратура».

У новую кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Васіля Зуёнка ўвайшлі вершы пра нашага сучасніка — чалавека-працаўніка, улюбёнага ў сваю зямлю, у яе спрадвечную прыгажосць, чалавека сціплага і душэўна шчодрага. Лірычны герой паэта глядзіць у сённяшні дзень вачамі памяці, вачамі перажытага народам у суровых выпрабаваннях, і таму ў адказе за будучыню, за мір на зямлі.

І. НОВІКАЎ. «Ачышчэнне». Раман. — Мн., «Мастацкая літаратура».

Раман прысвечаны мужнасці савецкіх людзей, праяўленай у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама працоўнаму гераізму ў нашы дні.

Твор шматпланавы, шырокі па ахопу падзей і праблем, якія даводзіцца вырашаць героям. Яны праходзяць цяжкія выпрабаванні на вернасць Айчыне, упарта пераадольваюць перашкоды, якія сустракаюцца ў жыцці, уласныя слабасці і памылкі.

І. БУРСАЎ. «Сорак сарок». Казкі.—Мн., «Юнацтва».

З многімі не падобнымі адзін да аднаго героямі пазнаёмяцца юныя чытачы, адкрыўшы новую кнігу вядомага пісьменніка-казачніка Івана Бурсава. На яе старонках жывуць дэльфіна Плюм і пінчэр Боб, прынц Кукарэку з паветранага шарыка і два індыкі з аднаго куфра... Забаўныя празаічныя казкі, у якіх адбываюцца незвычайныя прыгоды, аўтар звязаў вясёлымі вершамі ў адзін вялікі і захапляючы твор.

М. НІКІФАРАЎ, Б. ЯЛІНСКАЯ, Л. ШКЛЯРАЎ. «Птушкі Беларусі», Даведнік-вызначальнік гнёздаў, яек. — Мн., «Вышэйшая школа».

Прысвечана аднаму з цікавейшых, малавывучаных бакоў біялогіі птушак — гнездавому жыццю. У кніжцы асвятляюцца пытанні будавання гнёздаў, даецца характарыстыка гнёздаў і яек 200 відаў птушак, якія насяляюць Беларусь. Кніга добра ілюстравана каляровымі фатаграфіямі. Можа служыць дапаможнікам не толькі для спецыялістаў арнітолагаў, настаўнікаў-біёлагаў, работнікаў сельскай і лясной гаспадаркі, але і для аматараў прыроды.

І. РАЗЕТ. «Што такое эўрыстыка». 2-е выданне дапоўненае і перапрацаванае.—Мн., «Народная асвета».

Што азначае эўрыстычная дзейнасць? Якіх поспехаў дабіліся псіхолагі ў раскрыцці заканамернасцей творчасці? Ці можна навучыць вырашаць «нестандартныя» задачы? Што садзейнічае, а што перашкаджае адкрыццю новага? У чым сакрэт арыгінальнасці мыслення? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні чытачы знойдуць у кнізе.

ГЭТЫЯ КНІГІ ВЫ МОЖАЦЕ ЗАКАЗАЦЬ ПРАЗ НАСТУПНЫЯ ФІРМЫ:

NETHERLANDS

«Pegasus Boekhandel»
Leidsestraat 25
1017 NT Amsterdam,

FINLAND

«SN — Kiejat OY»
Tolppatie 8
SF-00880 Helsinki

ENGLAND

Central Books Ltd.
37 Gray's Inn Road
London W.C. IX 8PS
(Books in English)

Collet's Holdings Ltd.
Denington Estate, Wellingborough
Northants, NN8 2OT

Collet's Russian Bookshop
39 Museum Street
London W.C.1

SCHWEIZ

Pinkus Genossenschaft
Froschaugasse 7
8025 Zürich

Buchhandlung A. Francke AG
Postfach 1445
3001 Bern

AUSTRALIA

«New Era Books & Records»
64-68 Shepherd Street
Marrickville N.S.W. 2204

ESPANA

Librer[illegible] Rubinos-1860
Alcal[illegible]
28009 Madrid

USA

1. Victor Kamkin, Inc. 12224 Pa[illegible]n Drive Ro[illegible]le, Md. 20852/USA
2. Victor Kamkin, Inc. 149 Fifth Ave. New York, N. Y. 10010/USA
3. Imported Publications 320 West Ohio St. Chicago, 111. 60610/USA
4. «Znanie» Bookstore 5237 Geary Blvd. San Francisco, Calif. 94118/USA

BRD

1. «Kubon & Sagner» Postfach 34 01 08 8000 München 34
2. Brücken-Verlag GmbH Postfach 1928 4000 Düsseldorf 1

ITALIA

Italia — URSS
Via Edilio Raggio, 1—10
Genova

Italia — URSS
Piazza della Republica 47
Roma

Libreria Edest s.n.c.
Edizioni Estere
Via Cairoli 12/4
16124 Genova

FRANCE

Les Livres Etrangers
10, rue Armand Moisant
Paris 15 France

Librairie du Globe
2, rue de Buci
Paris 6 France

CANADA

Progress Books
71 Bathurst St.,
3rd Floor
Toronto, Ontario
M5V 2P6

Troyka Ltd.
College St. 799A
Toronto, Ontario
M6G 1C7

Canadian Importers Co. Ltd.
P. O. Box 1640, 10215-97 St.,
Edmonton, Alberta

Ukrainska Knyha
962 Bloor St. West
Toronto Ontario
M6H 1L6

Librairie Nouvelles
Frontières
185 Rue Ontario
Montreal Quebec
H2X 1H5

People's Co-op Bookstore
353 West Pender St.,
Vancouver 3, B.C. V6B 1T3

САЧЫЦЕ ЗА НАШАЙ РЭКЛАМАЙ



ЛЮБІМАЕ МЕСЦА СУСТРЭЧ

Сюды пасля заняткаў фізікай і хіміяй, матэматыкай і літаратурай з'язджаюцца хлопчыкі і дзяўчынкі з усяго горада. Тут чакае іх сустрэча з мастацтвам, тут зведваюць яны свет прыгожага і робяць першыя крокі ў творчасці.

У Аршанскай мастацкай школе займаецца каля ста дзяцей, якія трапілі сюды ў выніку конкурснага адбору. Яны вывучаюць гісторыю мастацтва, асновы станковай і дэкаратыўнай кампазіцыі, авалодваюць малюнкам, жывапісам, скульптурай. Школа многім дзецям дапамагае выбраць жыццёвы шлях. Выпускнікі яе вучацца на мадэльераў-канструктараў у Віцебску, удасканальваюць сваё майстэрства ў мастацкім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы ў Бабруйску, у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце, на архітэктурным факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута.

НА ЗДЫМКАХ: заняткі па асновах кампазіцыі вядзе выкладчык Леў ЦВЯТКОЎ; першы год займаюцца ў мастацкай школе Света СЯМЁНАВА (злева) і Аксана ХВАСТАНЦАВА.

Фота Я. КАЗЮЛІ.



РОДНАЕ-БЛІЗКАЕ

ЛЮТЫ, ЯК ЛЮТЫ

У той лютаўскі дзень была прыгожая спакойная раніца. На вуліцы трымаўся невялікі марозік. Недзе апоўдзень выглянула сонейка, з шыферных стрэх пачало капаць, забарабаніла па падаконніку: кап! кап! кап!

Хіба ж уседзіш у хаце ў такі дзень, вось і пайшоў у лес.

Іду па вытаптанай у снезе сцяжынцы. Над ёю прагнуліся пад белымі шапкамі танклявыя галінкі бяроз. «Лес стварыў ганаровую арку для сустрэчы вясны»,— падумалася. Стаю, нібы ў казцы, на поўныя грудзі ўдыхаю пах халоднага лесу, слухаю цішыню маўклівага, дрымотнага наваколля. Але нейкая незразумелая трывога прабегла ў думках. «Чаму не чуваць, не відаць лясных жыхароў? Прыталіся, няйначай».

Пачуццё не падманула. Пад вечар нечакана над лесам прабег шустры ветрык, і неўзабаве загаманілі верхавіны высокіх ялін, што ўзнімалі ў неба свае пуховыя шаты. З іх сыпаўся снег, нібы хто змятаў яго. Праз момант над лесам ужо гуляў вецер, гнаў нізкія хмары, якія селі і сеялі снег.

Заставацца ў лесе стала непрыемна, і я пайшоў на дарогу. Лес скончыўся і адкрыўся шырокі затуманены снегам прастор. На ім парывісты вецер уздымаў з зямлі снег, гнаў і нёс яго наперад, пасвістваючы.

Вось яна, завея-завіруха. Адчувае зіма блізкі канец, таму паказвае свой нораў, змагаецца. Падняўшы каўнер, паскорыў хаду ў кірунку вёскі, што віднелася наперадзе.

У вёсцы было, здаецца, цішэй, але між будынін і ў голых дрэвах абсад вецер скуголіў, свістаў, стагнаў, пагражаў, стукаў снегам у сцены і вокны, засыпаў сцяжынкі, вуліцу, умомант насыпаў гурбы ля плотаў.

Паспяшаўся, ускочыў у хату. Не распранаючыся, сеў ля цёплага стаяка, і нагадалася прымаўка, што бытуе ў народзе: «Пытае люты, а ці добра абуты», і другая: «Добра па блукаць па лесе, калі ведаеш, што цябе чакае цёплая, утульная хата, усё роўна, як цікава паездзіць па замежных краінах, калі ведаеш, што ў цябе ёсць твая Радзіма. Без яе, як і без цёплай хаты, не пагрэешся».

Я. КРАМКО.

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 299